# Тлехуч Салех Гісавіч



Тлехуч Салех Гісавіч нарадзіўся 11 ліпеня 1916 года непадалёку ад г.Майкоп Адыгейскай аўтаномнай вобласці Краснадарскага края. Па нацыянальнасці – адыгеец. Дзяцінства прайшло ў горным ауле Ассакалай. Сям'я была вялікай: у Салеха было шэсць родных братоў. Хлопчык рос здатным да вучобы.

У 1939 годзе Салеха прызвалі на воінскую службу. Па спецыяльнаму набору ён быў накіраваны на вучобу ў Краснадарскае ваенна-авіяцыйнае вучылішча штурманаў. У 1940 годзе паспяхова закончыў вучобу і амаль перад самай вайной па размеркаванню быў накіраваны ў г.Бранск у 8 авіяцыйны полк. Тут маладога летчыка і застала Вялікая Айчынная вайна.

Першы баявы вылет авіяцыйны полк, у якім служыў лейтэнант С.Тлехуч, здзейсніў 22 ліпеня 1941 года ў накірунку г.Смаленска. Тлехуч С.Г. у якасці штурмана самалета прымаў удзел ў знішчэнні ворага ў складзе ІІІ і IV Украінскіх франтоў на тэрыторыі Польшчы, Чэхаславакіі, Румыніі, Венгрыі і Аўстрыі.

7 красавіка 1945 года ў паветраным баі над Альпамі Тлехуч С.Г. быў цяжка паранены ў левую руку і адначасова атрымаў асколачнае раненне і кантузію. У цяжкім стане ён быў накіраваны на лячэнне ў эвакуацыйны шпіталь № 3111 у г.Бас, дзе знаходзіўся да 10 ліпеня 1945 года. Са шпіталя хлопец быў накіраваны ў запасны полк у Бухарэст, а потым эшалонам адпраўлены ў Беларускую ваенную акругу.

Пасля дэмабілізацыі ў ліпені 1946 года быў накіраваны на работу ў Падсвільскую сярэднюю школу выкладчыкам фізічнай культуры і ваеннай справы.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Вялікай Айчыннай вайны ІІ ступені, многімі медалямі.